чэрв. і вер. 1944 у Ленінградскай вобл. пры захопе палонных, у студз. 1945 пры прарыве абароны ворага на левым беразе р. Нараў (Польшча). Пасля вайны на с.-г. рабоце.

**СТРУ́КАЎ** Дзмітрый Міхайлавіч (1827?—1899), рускі мастак, археолаг, педагог. Скончыў Строганаўскае вучылішча ў Маскве. У 1849 заснаваў вучылішча малявання пры Троіца-Сергіевай лаўры (г. Сергіеў Пасад Маскоўскай вобл.). У 1864 ажыццявіў экспедыцыю па Беларусі, зрабіў замалёўкі помнікаў архітэктуры і краявідаў Магілёва, Маладзечна, Мінска [у т.л. Петрапаўлаўскай (Кацярынінскай) царквы], Нясвіжа, Полацка, Рагачова, мяст. Раманава (цяпер в. Леніна Слуцкага р-на) і інш., фрагментаў асобных збудаванняў, эпіграфікі, твораў выяўл. і дэкар.-прыкладнога мастацтва (у т.л. крыж Ефрасінні Полацкай). Праводзіў арх.-археал. пошукі на Беларусі і Украіне, у т.л. ў Крыме. Дзённікі, палявыя запісы, малюнкі С. — каштоўны матэрыял для вывучэння гісторыі бел. дойлідства.

*А.А.Трусаў, Ю.А.Якімовіч.*



Дз.**Струкаў**. Петрапаўлаўская (Кацярынінская) царква ў Мінску.

**СТРУКАЧО́Ў**, вёска ў Кармянскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 15 км на ПдЗ ад г.п. Карма, 100 км ад Гомеля, 67 км ад чыг. ст. Рагачоў. 394 ж., 120 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў.

**СТРУКТУ́РА** (ад лац. structura будова, размяшчэнне), сукупнасць устойлівых сувязей аб'екта, якія забяспечваюць яго цэласнасць пры знешніх і ўнутр. зменах. Уяўляе сабой спосаб узаемадзеяння элементаў сістэмнага ўтварэння, пры якім унутр. сувязі больш моцныя, чым знешнія, што абумоўлівае захоўванне якасных характарыстык *сістэмы.* У значнай ступені ўплывае на элементы сістэмы; часам адзін і той жа элементны састаў дзякуючы С. можа ўтвараць розныя сістэмы (напр., з'явы *ізамерыі* ў хіміі). Першапачаткова тэрмін «С.» ўжываўся ў навуцы для абазначэння формы. У 19 ст. ў сувязі з узнікненнем *хімічнай будовы тэорыі*, паняцце С. стала разглядацца як спосаб арганізацыі элементаў сістэмнага ўтварэння. З 20 ст. аналіз структурных адносін і сувязей займае значнае месца ў даследаваннях мовы, культуры, псіхалогіі, грамадства і інш. (гл. *Гештальтпсіхалогія*, *Структуралізм*, *Структурна-функцыянальны аналіз*). Паняцце С. цесна звязана з катэгорыямі *агульнай тэорыі сістэм* (сістэма, элемент, *цэласнасць*, *арганізацыя*) і *кібернетыкі* (*функцыя*).

*М.І.Жукаў.*

**СТРУКТУ́РА** ў матэматыцы, тэрмін, які аб'ядноўвае паняцці, дастасавальныя да *мностваў* з нявызначанай прыродай іх элементаў; адно з асн. паняццяў алгебры. Для вызначэння С. задаюць суадносіны паміж элементамі дадзенага мноства (характарыстыка тыпу С.) і пастулiруюць, што гэтыя суадносіны задавальняюць пэўныя ўмовы (аксіёмы). Напр., С. ўтварае мноства цэлых дадатных лікаў з аперацыямі вызначэння найб. агульнага дзельніка і найменшага агульнага кратнага, мноства рэчаісных лікаў з аперацыямі вызначэння большага і меншага лікаў з 2 зададзеных. С. выкарыстоўваюцца ў матэм. логіцы, тэорыях імавернасці, груп, мностваў, функцыянальным аналізе, тапалогіі і інш.

**СТРУКТУ́РА ГЛЕ́БЫ**, асобныя агрэгаты глебы, камякі розных памераў, формы, якаснага саставу, на якія яна распадаецца ў стане спеласці (гл. *Спеласць глебы*). Кожны агрэгат мае складаную будову, з'яўляецца комплексам мех. элементаў (гл. *Грануламетрычны склад глебы*), якія звязаны ў мікра- і макраагрэгаты гумусам, калоідамі, каранямі раслін і інш. Паводле формы агрэгатаў вылучаюць С.г. глыбістую, арахаватую, зярністую, слупчастую, прызматычную і інш. Ад С.г. залежыць *урадлівасць глебы*. Найб. аптымальная камякавата-зярністая С.г., памер агрэгатаў 0,25—10 мм. Разбураецца С.г. механічна пры шматразовай апрацоўцы, таксама ў выніку хім. і мікрабіял. працэсаў. Для аднаўлення С.г. сеюць шматгадовыя травы, уносяць арган. ўгнаенні і інш. На Беларусі пераважаюць дзярнова-падзолістыя бесструктурныя глебы.

**СТРУКТУ́РА ГО́РНАЙ ПАРО́ДЫ**, сукупнасць прыкмет горнай пароды, абумоўленая памерамі і формай мінер. зерняў, ступенню крышталічнасці, спосабам спалучэння крышталяў паміж сабой і з вулканічным шклом і інш.; адна з гал. дыягнастычных і класіфікацыйных прыкмет горных парод. Абумоўлена паходжаннем пароды і выкарыстоўваецца для яго вызначэння.

Паняцце сфармуляваў швейц. мінералог У.Грубенман у 1904, удакладніў і развіў сав. вучоны А.М.Заварыцкі. Вылучаюць зярністую, шклаватую, парфіравую і інш. структуры. Марфал. адзінкай структуры з'яўляецца мінер. зерне. Даследуецца пад мікраскопам у шліфах. Цесна звязана з *тэкстурай горнай пароды*.

**СТРУКТУ́РА МЕТА́ЛУ**, унутраная будова *металу* (сплаву). Адрозніваюць макра- і мікраструктуру. Макраструктуру назіраюць няўзброеным вокам ці праз лупу, што дае магчымасць выяўляць *дэфекты металаў*. Мікраструктуру вывучаюць з дапамогай аптычных ці электронных мікраскопаў, па ёй мяркуюць аб памерах, форме, узаемным размяшчэнні зерняў розных фаз металу. Унутр. будову асобных зерняў даследуюць метадамі *электронаграфіі* і *рэнтгенаструктурнага аналізу*.

**СТРУКТУ́РА ПАПУЛЯ́ЦЫІ**, характар размеркавання асобін у прасторы, а таксама паводле палавых, узроставых і інш. марфалагічных і фізіялагічных адзнак; адзін з кампанентаў папуляцыйнай біялогіі. Адрозніваюць прасторавую, іерархічную, дэмаграфічную, сацыяльную С.п. і інш. Многія параметры С.п. абумоўліваюцца дынамікай колькасці асобін, што складаюць папуляцыю (у часе, прасторы), узаемадзеяннем асобін з абіятычнымі і біятычнымі фактарамі асяроддзя. Вывучэнне С.п. дазваляе распрацоўваць сродкі і спосабы рацыянальнага выкарыстання біял. рэсурсаў, прыродаахоўных мерапрыемстваў і інш.

*Літ.*: Майр Э. Популяции, виды и эволюция: Пер. с англ. М., 1974; Солбриг О., Солбриг Д. Популяционная биология и эволюция: Пер. с англ. М., 1982; Радкевич В.А. Экология. 3 изд. Мн., 1997.

**СТРУКТУРАЛІ́ЗМ**, кірунак у сацыягуманітарных навуках 20—21 ст., арыентаваны на выяўленне *структуры* грамадства і культуры і структурных узаемазалежнасцей паміж іх кампанентамі; сукупнасць тэарэтыка-метадалагічных падыходаў да сацыялагічнага і культуралагічнага аналізу грамадства і культуры, іх структурных узаемадзеянняў і асаблівасцей. Першапачаткова быў распрацаваны ў лінгвістыцы (гл. *Структурная лінгвістыка*), пазней пашырыўся ў этнаграфіі, антрапалогіі, сацыялогіі, псіхалогіі, культуралогіі і інш. Разглядае культуру і грамадства як сукупнасць знакавых сістэм (мова, навука, мастацтва, рэлігія, міфалогія, звычаі і інш.), якія апасродкуюць узаемаадносіны чалавека і соцыуму. Мэта структурнага аналізу пэўнага аб'екта — пошук унутр. заканамернасцей яго пабудовы, якія вызначаюць яго абстрактна-родавыя ўласцівасці і прыкметы. Структуралісты даследуюць усе з'явы, даступныя эмпірычнаму вопыту, як «эпіфеномены» (знешняе выяўленне глыбінных унутр. структур), імкнуцца гуманіт. ведам надаць статус дакладных навук, што абумоўлівае стварэнне строгага фармалізаванага паняційнага апарату С., схільнасць да лагічных і матэм. формул, выкарыстанне тлумачальных схем і табліц.

Асновы С. ў вывучэнні сацыякульт. з'яў закладзены *К.Леві-Стросам*, які пры даследаванні першабытнай культуры аб'яднаў лінгвістычны, семіятычны, этнаграфічны і філас. падыходы і сцвярджаў, што асн. кампаненты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ